**Антановіч Н. М.**, *дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;*
**Антонава Н. У.**, *начальнік аддзела метадычнага забеспячэння пачатковай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

# Беларуская мова. II клас

## Установы адукацыі з беларускай мовай навучання

*Працяг. Пачатак гл. № 9 за 2022 г.*

### Урок 22. Кантрольнае спісванне

***Мэты ўрока:*** праверыць сфарміраванасць навыку спісвання з друкаванага тэксту ў адпаведнасці з алгарытмам спісвання; развіваць стараннасць, уважлівасць, адказнасць; выхоўваць клапатлівыя адносіны да жывёл.

***Абсталяванне:*** фотаздымкі або малюнкі да тэксту (мядзведзь у бярлозе, барсукі спяць у нары, лісіцы мышкуюць у полі, вавёркі ў зімовым футры);

карткі з тэкстам для кожнага вучня.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап паведамлення тэмы і мэт урока.**

Настаўнік паведамляе вучням, што на працягу першага класа і ў пачатку другога класа яны практыкаваліся ў спісванні слоў, сказаў, тэкстаў, а сёння ў іх незвычайны ўрок — урок кантрольнага спісвання.

Настаўнік стварае атмасферу псіхалагічнага камфорту.

**3. Падрыхтоўка да ўспрымання тэксту.**

Перад знаёмствам з тэкстам настаўнік можа задаць вучням наступныя пытанні: «Якая зараз пара года? Якія змены адбываюцца ў прыродзе восенню? Як жывёлы рыхтуюцца да зімы?»

**4. Этап работы па тэме ўрока.**

***Знаёмства з тэкстам.***

Настаўнік выразна чытае тэкст. (Картка з тэкстам знаходзіцца на парце ў кожнага вучня.) Вучні ўважліва слухаюць і разглядаюць малюнкі (фотаздымкі) на дошцы.

У лістападзе

У лістападзе кладзецца ў бярлогу мядзведзь. У гэты час засынаюць таксама ў сваіх норах барсукі. Лісіцы мышкуюць у палях. Вавёркі мяняюць сваё летняе футра на зімняе. *(28 слоў)*

*Віталь Вольскі* [1, с. 80]

Тэксты на выбар настаўніка:

Позняй восенню

Вось і скончылася цёплае лета. Неба амаль заўсёды зацягнута шэрымі хмарамі. Часта ідуць дажджы. З дрэў ападае апошняе лісце. Не чуваць спеваў птушак. *(25 слоў)*

Успаміны пра лета

Як цудоўна было летам на лузе! Пахне мёдам канюшына. Бялеюць у траве рамонкі. Радуюць вочы блакітныя васількі. Над кветкамі лятаюць маленькія матылькі. Хутчэй бы зноў лета! *(29 слоў)*

Настаўнік можа выкарыстаць іншы тэкст, падабраны або складзены ў адпаведнасці з патрабаваннямі «Метадычных рэкамендацый па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі».

***Гутарка на разуменне зместу тэксту, тлумачэнне незразумелых слоў.***

Пасля праслухоўвання тэксту настаўнік можа задаць вучням наступныя пытанні: «Значэнне якіх слоў вы не зразумелі? (Варта растлумачыць значэнне слова *мышкаваць* — лавіць мышэй.) Як рыхтуецца да зімы мядзведзь? Што адбываецца ў лістападзе з барсуком? Як паводзіць сябе ліса? Якія змены адбываюцца з вавёркай?» З апорай на фотаздымак вучні адзначаюць, што футра ў вавёрак восенню становіцца шэрым.

***Паўторнае чытанне тэксту вучнямі.***

Магчымы розныя варыянты арганізацыі работы: кожны вучань чытае тэкст самастойна; адзін вучань чытае тэкст услых, а астатнія сочаць.

***Графіка-арфаграфічная падрыхтоўка.***

Настаўнік цікавіцца, колькі ў тэксце сказаў, як трэба правільна афарміць сказ на пісьме. *(Першае слова ў сказе пішацца з вялікай літары, у канцы сказа ставіцца знак прыпынку. Усе словы трэба пісаць асобна.)*

Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на напісанне слова *мядзведзь*. Прапануе вучням растлумачыць правапіс слоў *сваіх*, *палях*.

***Паўтарэнне алгарытму спісвання.***

Пад кіраўніцтвам настаўніка вучні прыгадваюць алгарытм спісвання. Пры неабходнасці звяртаюцца да форзаца 2 вучэбнага дапаможніка.

***Спісванне тэксту вучнямі.***

Пасля завяршэння работы настаўнік нагадвае вучням пра самаправерку ўсяго тэксту.

**5. Этап падвядзення вынікаў урока.**

Настаўнік цікавіцца, з якімі цяжкасцямі вучні сутыкнуліся на ўроку, як яны думаюць, ці атрымалася ў іх спісаць тэкст без памылак.

**Урок 23. Работа над памылкамі.**
**Правапіс літар *е, ё — я***

***Мэты ўрока:*** фарміраваць уменне выконваць работу над памылкамі; пазнаёміць з правілам правапісу літар ***е, ё — я***; фарміраваць уменне прымяняць правіла на пісьме, правільна вымаўляць словы з ***е, ё — я***; адпрацоўваць уменне вызначаць націскны і першы пераднаціскны склады, уменне пісаць пад дыктоўку сказ; пазнаёміць са слоўнікавым словам *месяц*; развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць любоў да роднага краю.

***Абсталяванне:*** малюнак, на якім адлюстравана маска; картка са слоўнікавым словам *месяц*; карткі са словамі *снежинка, темнеть, зелёный, сестра, сняжынка, цямнець, зялёны, сястра*;

карткі з заданнем для самастойнай работы.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап выканання работы над памылкамі, дапушчанымі ў кантрольным спісванні.**

Настаўнік расказвае пра вынікі кантрольнага спісвання, адзначае тыповыя памылкі, якія калектыўна разбіраюцца. На дошцы запісваецца ўзор выканання работы над памылкамі.

Затым арганізуецца самастойная работа вучняў над памылкамі. Пры неабходнасці настаўнік аказвае дапамогу індывідуальна.

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Абмеркаванне праблемнай сітуацыі.***

Настаўнік прапануе вучням паслухаць гісторыю пра тое, як Чамучык гуляў у перакладчыка з бабуляй.

Настаўнік вывешвае на дошцы карткі са словамі *снежинка, темнеть, зелёный, сестра, сняжынка, цямнець, зялёны, сястра* і просіць іх размеркаваць на дзве групы.

— Вымавіце словы, запісаныя па-беларуску. Што вы заўважылі ў напісанні гэтых слоў? Прачытайце праблемнае пытанне на с. 74. Ці можаце вы адказаць, калі ў словах замест ***е, ё*** пішацца ***я***?

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Настаўнік аб'яўляе тэму ўрока, адзначае, што сёння на ўроку вучні абавязкова знойдуць адказ на праблемнае пытанне.

***Практыкаванне 108.***

Выкананне задання арганізуецца з каменціраваннем на дошцы. Вучань чытае першую пару слоў (звер — звяры). Настаўнік задае пытанні:

— Які гук вымаўляецца ў першым слове пад націскам? *(Гук* [э].*)* Якой літарай ён абазначаны на пісьме? *(Літарай* ***е.****)* Які гук вымаўляецца ў першым складзе перад націск замест ***е*** ў слове *звяры? (Гук* [а].*)* Якой літарай ён абазначаны на пісьме? *(Літарай* ***я.****)* Запішыце пару слоў, падкрэсліце літару, якая пішацца замест ***е, ё*** ў першым складзе перад націскам. *(Звер — звяры.)*

Аналагічна арганізуецца разбор кожнай пары слоў. *(Лес — лясы, снег — снягі, сёлы — сяло́, плечы — плячо́, вёдры — вядро́.)*

Пасля запісу слоў настаўнік цікавіцца ў вучняў, ці могуць яны зараз адказаць на праблемнае пытанне: «Калі ў словах замест ***е, ё*** пішацца ***я***?» (Вучні самастойна фармулююць правіла.)

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Настаўнік прапануе пераканацца ў правільнасці зробленага вываду і чытае інфармацыю з рубрыкі «Трэба ведаць» (с. 75).

— Калі ў словах замест ***е, ё*** пішацца ***я***? Якая літара захоўваецца ў ненаціскных складах?

Пад кіраўніцтвам настаўніка вучні разглядаюць другую схему на форзацы 2 вучэбнага дапаможніка і з апорай на яе расказваюць, калі ў словах пішуцца літары ***е, ё, я***.

***Практыкаванне 109.***

Выкананне задання можа быць арганізавана наступным чынам каля дошкі. Вучань чытае сказы, запісаныя пад лічбай 1. Настаўнік прапануе выразна вымавіць словы з прапушчанымі літарамі, вызначыць націскны склад, растлумачыць, якую літару трэба запісаць на месцы пропуску. Вучань каменціруе: «Вымаўляю слова — [кв'этак]. Вызначаю націскны склад — [КВ'Э-так]. У слове *кветак* пад націскам пішу літару ***е***. У слове *квяцістым* вызначаю націскны склад. Націск падае на другі склад — [ц'і]. У першым складзе перад націскам замест ***е*** пішу ***я***». Вучань запісвае пару слоў у адпаведнасці з узорам у вучэбным дапаможніку. Такім чынам арганізуецца аналіз і запіс кожнай пары слоў. *(Дзе́ці — дзяце́й, ве́чар — вячэ́рні, гнёзды — гняздо́.)*

***Практыкаванне 110.***

Настаўнік выразна чытае верш. Затым арганізуецца гутарка па пытаннях: «Пра якую з'яву гаворыцца ў вершы? Калі яе можна ўбачыць? Ці назіралі вы калі-небудзь за адлётам жураўлёў або іншых птушак? Які настрой выклікае адлёт птушак? Чаму? З якой інтанацыяй вы прачыталі б апошні сказ верша?»

Вучні чытаюць верш самастойна, знаходзяць словы з прапушчанымі літарамі і тлумачаць іх правапіс. Прывядзём магчымы ўзор тлумачэння вучня: «У слове *ляцяць* вызначаю націск — падае на дугі склад. У першым складзе перад націскам трэба напісаць літару ***я***».

Перад запісам першага сказа пад дыктоўку пажадана прыгадаць разам з вучнямі «Алгарытм пісьма пад дыктоўку», для гэтага можна звярнуцца да форзаца 2 вучэбнага дапаможніка. Настаўнік папярэджвае, што сказ будуць запісваць на двух радках, у слупок, паколькі гэта вершаваны тэкст.

Пасля запісу сказа вучні самастойна ставяць у словах націск, падкрэсліваюць першы пераднаціскны склад у словах, у якіх ён ёсць. Можна арганізаваць узаемаправерку выкананага задання.

**4. Этап знаёмства са слоўнікавым словам.**

Настаўнік прапануе вучням разгадаць рэбус.




Настаўнік цікавіцца, якія значэнні слова *месяц* ведаюць вучні. *(Нябеснае цела, спадарожнік Зямлі. Дванаццатая частка астранамічнага года, у якой ад 28 да 31 дня.)*

— Вымавіце слова *месяц*. Падзяліце слова на склады. *(*[м'э-с'ац].*)* Колькі складоў у гэтым слове? *(2.)* Вымавіце слова, выдзяляючы голасам націскны склад. На які склад падае націск? *(На першы склад —* [м'э].*)* Назавіце гукі па парадку. *(*[м'] [э] [с'] [а] [ц].*)*

Настаўнік запісвае слова на дошцы або вывешвае картку са слоўнікавым словам.

| месяц |
|---|

Вучні чытаюць слова так, як яно запісана. Вызначаюць, ці супадае вымаўленне і напісанне слова. Настаўнік задае пытанні:

— Што вы можаце сказаць пра напісанне гэтага слова? *(Літара **я** ў паслянаціскным складзе.)* Ці адпавядае яно правілу, якое вывучалі на ўроку?

Вучні запісваць у сшытак слова *месяц*, ставяць націск, падкрэсліваюць літару ***я***.

— Як можна ласкава назваць *месяц*? *(Месячык.)*

Настаўнік запісвае на дошцы або вывешвае картка са словам *месячык*. Вучні дзеляць яго на склады, вызначаюць націск. Звяртаецца ўвага на літару ***я*** ў паслянаціскным складзе. Вучні запісваюць слова ў сшытках.

Настаўнік прапануе вучням скласці сказы са словам *месяц*, каб яно ўжывалася ў розных значэннях. Адзін сказ на выбар настаўніка можна прапанаваць запісаць.

**5. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 111.***

Тэкст можна прапанаваць прачытаць услых тром вучням (кожны чытае адну частку). Вучні расказваюць пра кожны восеньскі месяц у працэсе гутаркі па пытаннях:

— Якія змены ў прыродзе адбываюцца ў верасні? Чаму гэты месяц мае такую назву? Ці бачылі вы, як цвіце верас? Разгледзьце малюнак. Апішыце, як выглядае верас. *(Нізкая кустовая расліна з дробным лісцем і лілова-ружовымі кветкамі.)*

— Разгледзьце малюнак, размешчаны ніжэй. Ці здагадаліся вы, якой частцы тэксту ён адпавядае? *(Другой частцы, у якой расказваецца пра кастрычнік.)* Чаму месяц кастрычнік мае такую назву?

— Які малюнак вы намалявалі б да апошняй часткі тэксту? *(Ападае лісце з дрэў.)* Ці здагадаліся вы, чаму лістапад мае такую назву?

Вучні самастойна знаходзяць і выпісваюць словы з ***я*** ў першым складзе перад націскам. *(Адлятаюць, паспяваюць, звяры, мяняюць, ляцела.)* Затым арганізуецца франтальная праверка: вучні называюць словы і тлумачаць іх правапіс.

Настаўнік яшчэ раз звяртае ўвагу на напісанне новага слоўнікавага слова:

— У якім слове з тэксту ***я*** запісана не ў першым складзе перад націскам? *(Месяц.)*

Вучні дапаўняюць сказ патрэбным словамі: *Верасень, кастрычнік, лістапад — восеньскія месяцы.* Запіс сказа арганізуецца з каменціраваннем. Неабходна звярнуць увагу на пастаноўку косак і працяжніка ў сказе. Кожны вучань самастойна вызначае націск у словах сказа.

***Выкананне самастойнай работы.***

Кожны вучань атрымлівае картку з заданнем.

Прачытайце словы. Змяніце іх так, каб замест ***е, ё*** трэба было напісаць ***я***.

| | |
|---|---|
| лён — __________ | сёстры — __________ |
| пень — __________ | мётлы — __________ |
| мёд — __________ | слёзы — __________ |

Запішыце словы. Пастаўце націск і падкрэсліце першы склад перад націскам.

Праверка задання ажыццяўляецца настаўнікам самастойна.

**6. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 77, практ. 112. Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на тое, што прыказку неабходна запісаць у радок, як будзе змяшчацца. Пры неабходнасці словы можна пераносіць з аднаго радка на другі.

**7. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Якая літара пішацца замест ***е, ё*** ў першым складзе перад націскам? Якая літара пішацца ў астатніх складах?

## Урок 24. Правапіс літар *е, ё — я*

***Мэты ўрока:*** адпрацоўваць правіла правапісу літар ***е, ё — я*** ў словах, уменне правільна вымаўляць словы з ***е, ё, я***, дзяліць словы на склады, вызначаць націскны і першы пераднаціскны склады; фарміраваць уменне працаваць са схемай, тлумачыць правапіс слоў з апорай на схему; замацоўваць уменне вызначаць словы з літарамі ***ю, я***, якія абазначаюць два гукі; развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць эстэтычныя пачуцці.

***Абсталяванне:*** карткі з заданнем для самастойнай работы.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання.**

***Практыкаванне 112.***

Адзін вучань услых чытае прыказку *Кожная птушка сваё гняздо ведае*, тлумачыць яе сэнс. *(Кожны ведае і шануе свой родны край, імкнецца да яго.)*

Арганізуецца ўзаемаправерка пісьмовага задання.

**3. Этап актуалізацыі ведаў.**

***Практыкаванне 113.***

Настаўнік прапануе вучням паслухаць верш і адказаць на пытанні: «Пра якое правіла гаворыцца ў вершы? Калі ў словах замест ***е, ё*** пішацца ***я***?» Вучні самастойна чытаюць верш і знаходзяць словы на гэта правіла. Запіс слоў адбываецца з каменціраваннем. Узор: «У слове *лес* пад націскам пішу ***е***. Вымаўляю слова — [л’асны], вызначаю націскны склад — [л’а-СНЫ]. У слове *лясны* націск падае на другі склад. У першым складзе перад націскам пішу ***я***».

Настаўнік прапануе вучням прывесці свае прыклады слоў. 1–2 пары слоў на выбар настаўніка можна запісаць.

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Настаўнік цікавіцца ў вучняў: «Ці здагадаліся вы, якую тэму будзем працягваць вывучаць? Якія задачы будзем вырашаць?»

**4. Этап замацавання.**

— Як правільна вызначыць, якую літару — ***е, ё*** або ***я*** — трэба напісаць у слове? Якія дзеянні неабходна выканаць?

Арыентуючыся на ўзровень падрыхтаванасці вучняў, настаўнік можа арганізаваць пошук адказаў на пытанні па-рознаму.

Варыянт 1. Пад кіраўніцтвам настаўніка вучні складаюць алгарытм дзеянняў. Схема запісваецца на дошцы.

Варыянт 2. ***Практыкаванне 114.***

Выкананне задання пачынаецца з разгляду і аналізу схемы: устанаўленне правільнай паслядоўнасці дзеянняў для вызначэння правапісу ***е, ё — я***. Да гэтай

схемы вучні могуць звяртацца і пры выкананні іншых практыкаванняў па тэме.

Карыстаючыся схемай, вучні вызначаюць, якую літару трэба запісаць у словах. Першыя два словы вучні каменціруюць услых для ўсяго класа і запісваюць іх на дошцы. *(Сняжóк, зеленавáты.)* Затым арганізуецца работа ў парах з астатнімі двума словамі: вучні расказваюць адзін аднаму. *(Снягíр, вясялíць.)* Кожны самастойна запісвае словы ў сшытак.

***Практыкаванне 115.***

Спачатку вучні чытаюць словы, запісаныя ў кожным слупку, замест малюнкаў называюць адпаведныя словы. *(Снег, снягі, снегавы, сняжынка. Вецер, вятры, вецярок, вятрак. Бег, бягуць, прабежка, бягун.)* Неабходна пацікавіцца ў вучняў, ці ведаюць яны, для чаго патрэбныя ветракі, ці бачылі калі-небудзь іх. *(Гэта механізм для атрымання электрычнай энергіі.)*

Затым арганізуецца тлумачэнне правапісу слоў. Калектыўна разглядаецца і разбіраецца кожны радок слоў. Вучні называюць, якая літара пішацца пад націскам у словах першага радка. *(Літара **е**.)* Вызначаюць націск у словах другога радка, называюць першы пераднаціскны склад і тлумачаць правапіс слова.

Настаўнік прапануе вызначыцца, хто будзе «пілотам» (запісвае словы трэцяга радка: *сне|га|вы́, ве|ця|ро́к, пра|бе́|жка*), а хто — «касманаўтам» (запісвае словы чацвёртага радка: *сня|жын|ка, вя|тра́к, бя|гу́н*). Адзін «пілот» і адзін «касманаўт» запісваюць словы на дошцы з адваротнага боку, усе астатнія вучні працуюць самастойна. Пасля выканання задання арганізуецца праверка з апорай на ўзор на дошцы.

***Практыкаванне 116.***

Перад чытаннем тэксту настаўнік дае ўстаноўку: «Падрыхтуйце адказ на пытанне “Чаму звыклая дарога ў школу падалася Свеце незвычайнай?”».

У працэсе працы з тэкстам вучні вызначаюць па тлумачальным слоўніку ў канцы вучэбнага дапаможніка значэнне слоў *барвовыя, пярэсты*.

Аналіз зместу тэксту можна арганізаваць з выкарыстаннем наступных пытанняў:

— Якой дарогай ходзіць Святланка ў школу? Якія словы з тэксту пацвярджаюць, што гэта дарога дзяўчынцы вельмі знаёмая? Прачытайце. *(Света ведае тут кожны куток, кожнае дрэва.)* Што нагадвала дзяўчынцы лісце? *(Жоўтыя кружочкі, барвовыя далонькі, ружовыя сэрцайкі.)* Ці разглядвалі вы калі-небудзь лісты восенню? Што яны нагадваюць вам? Як вы думаеце, чаму дзяўчынцы шкада было ступіць на «пярэсты дыван»? Ці гулялі вы калі-небудзь па восеньскім парку? Якія пачуцці вы адчувалі?

— Як выглядае ваша дарога ў школу? Ці адрозніваецца яна ў розныя поры года? (Выслухоўваюцца расказы некалькіх вучняў.)

Пасля працы па развіцці звязнага вуснага маўлення франтальна арганізуецца тлумачэнне правапісу слоў з прапушчанымі літарамі. *(Святлана, дзядулем, дарогай, Света, масток, квяцісты, зямлі, далонькі, злятаюць, Светачка, ляжыць.)*

У другой частцы тэксту вучні калектыўна знаходзяць словы з літарамі ***ю, я***, якія абазначаюць два гукі, і самастойна запісваюць іх. *(Жоўтыя, барвовыя, ружовыя, злятаюць.)*

— Якія літары, акрамя ***ю, я***, могуць абазначаць два гукі? Калі гэта адбываецца?

***Выкананне самастойнай работы.***

Кожны вучань атрымлівае картку з заданнем.

Збярыце восеньскі букет з лістоў. Расфарбуйце каляровым алоўкамі словы, запісаныя па-беларуску.




Пры праверцы задання можна задаць пытанне:

— Букет з якіх слоў у вас атрымаўся? *(Сняжок, гняздо, зямля, мядок, вясна.)*

**5. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 81, практ. 117. Настаўнік нагадвае, што верш трэба запісаць у слупок. Націск неабходна паставіць толькі ў словах першага сказа.

**6. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Калі ў словах замест ***е, ё*** пішацца ***я***? Раскажыце, як правільна дзейнічаць, каб вызначыць, якую літару — ***е, ё*** або ***я*** — трэба запісаць у слове.

## Урок 25. Правапіс літар *е, ё — я*

***Мэты ўрока:*** адпрацоўваць правіла правапісу літар ***е, ё — я*** ў словах, уменне дзяліць словы на склады, вызначаць націскны і першы пераднаціскны склад; фарміраваць уменне правільна вымаўляць і перадаваць на пісьме словы з ***я, і*** ў першым складзе перад націскам; развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць любоў да працы.

***Абсталяванне:*** карткі са схемай «Прапавіс ***е, ё — я***».

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання.**

***Практыкаванне 117.***

Адзін вучань выразна чытае верш услых. Затым арганізуецца гутарка па пытаннях: «Пра якія дываны расказвае аўтар верша? Калі іх можна ўбачыць? Што вы ўяўлялі, калі слухалі верш?»

Вучні тлумачаць, якія літары трэба ўставіць у словы на месцы пропускаў. Пры гэтым прыгадваюць правілы правапісу ***о, э — а*** і ***е, ё — я***. Правільнасць пастаноўкі націску ў словах першага сказа можна арганізаваць наступным чынам:

— У якім слове вы не паставілі націск? *(Дрэў.)* Чаму? *(Гэта слова з аднаго склада.)* У якім слове націск падае на другі склад? *(Лісто́ту.)* У якіх словах — на трэці? *(Завіру́ха, залата́я, абмята́е.)*

**3. Этап актуалізацыі ведаў і замацавання.**

Настаўнік раздае вучням карткі са схемай і прапануе запоўніць пропускі: успомніць паслядоўнасць дзеянняў для вызначэння напісання літар ***е, ё, я***. Затым арганізуецца калектыўная праверка выкананага задання.

1. Вымаўляю слова.
2. Вызначаю націскны склад.

| | | |
|---|---|---|
| У ________ складзе | У 1-м складзе перад націскам | У іншых ненаціскных складах |
| пішу **е, ё** | замест __, __ пішу __ | пішу __ |

Гэту карту вучні могуць выкарыстоўваць і пры выкананні іншых практыкаванняў па тэме (у якасці падказкі).

***Практыкаванне 118.***

Настаўнік прапануе вучням назваць, што яны бачаць на малюнку. *(Елкі.)* Вучні чытаюць словы, запісаныя побач з малюнкам. *(Ельнік, яловы, ялінка, елачка.)* Звяртаецца ўвага на сувязь слоў па значэнні.

Настаўнік высвятляе, значэнне якіх слоў вучні не ведаюць. Варта звярнуць увагу на значэнне слова *ельнік* — яловы лес; пацікавіцца, што можа быць яловым (напрыклад, шышка).

Выкананне пісьмовага задання, адзначанага ў вучэбным дапаможніку, можна арганізаваць наступным чынам: два вучні запісваюць словы на дошцы з адваротнага боку, усе астатнія — працуюць самастойна ў сшытках. Пасля выканання задання арганізуецца праверка з апорай на ўзор на дошцы. *(Е́ль|нік, я|ло́|вы, я|лі́н|ка, е́|ла|чка.)* Вучні, якія працавалі каля дошкі, тлумачаць правапіс слоў.

***Практыкаванне 119.***

Настаўнік прапануе вучням прачытаць словы, запісаныя побач з малюнкамі, і сказаць, чым яны адрозніваюцца і да якіх малюнкаў адносяцца.

— Прачытайце пытанне пад першым малюнкам. Як вы на яго адкажаце? *(Касір будзе лічыць грошы.)* Прачытайце пытанне пад другім малюнкам. Адкажыце на яго. *(Урач будзе лячыць хлопчыка.)*

Адказ на кожнае пытанне вучні запісваюць з каменціраваннем. Настаўнік прапануе вучням паставіць націск у словах, якія адрозніваюцца адной літарай, і падкрэсліць літару галоснага гука ў першым пераднаціскным складзе. *(Лячыць — лічыць.)*

— Што вы заўважылі ў напісанні слоў? *(Словы адрозніваюцца адной літарай. У адным з іх у першым складзе перад націскам пішацца літара **і**.)* Ад чаго залежыць напісанне слова? *(Ад яго значэння.)*

***Практыкаванне 120.***

Настаўнік чытае верш. Затым арганізуецца гутарка па пытаннях:

— Чым былі занятыя браты? Калі яны пілавалі дровы? *(Раніцай, да сняданку.)* Пра што гэта сведчыць? *(Браты працавітыя, не лянуюцца, усталі рана.)* Чаму аўтар піша, што піла «весела пяе»? *(Калі «працуе» піла, чуецца спецыфічны гук.)*

Настаўнік прапануе вучням прачытаць верш самастойна, пасля чаго назваць словы, у якіх на месцы пропуску трэба напіоаць літару ***я*** (*сняданку, пяе*), а потым словы, у якіх прапушчана літара ***і*** (*пілуем, не піла, піла*). Пры гэтым папярэдне звяртаецца ўвага на правільнае вымаўленне слоў. Запіс слоў арганізуецца на дошцы (рознымі вучнямі па ланцужку) і ў сшытках кожным вучнем.

***Практыкаванне 121.***

Пасля прачытання тэксту праводзіцца гутарка па пытаннях:

— Колькі частак у тэксце? Аб чым расказваецца ў першай частцы? Як дзяўчынка з мамай вырошчвалі агурок у бутэльцы? Дакажыце, што дзяўчынка клапацілася, каб агурок вырас. Што вырашыла зрабіць Тамара з агурком, калі ён вырас? Як адрэагавалі аднакласнікі дзяўчынкі на агурок?

Перад тым як папрасіць вучняў расказаць, як вырасціць агурок, пажадана высветліць, ці дапамагалі яны бацькам вырошчваць якую-небудзь агародніну, што для гэтага спатрэбілася, калі і як гэта было. Настаўнік можа прапанаваць вучням вясной пасадзіць некалькі агуркоў у класе і паназіраць, як яны будуць расці.

Пасля працы па развіцці маўлення вучні тлумачаць правапіс слоў з прапушчанымі літарамі. Узор тлумачэння вучня: «Вымаўляю слова *цяпліца*. Вызначаю націскны склад — [ц'а-ПЛ'І-ца]. Націск падае на другі склад. У першым складзе перад націскам вымаўляю гук [а], на пісьме яго трэба абазначыць літарай ***я***». Аналагічна арганізуецца тлумачэнне правапісу кожнага слова з прапушчанай літарай.

Затым вучні запісваюць пад дыктоўку першую частку тэксту. Пры неабходнасці можна ўспомніць алгарытм спісвання, звярнуцца да форзаца 2 вучэбнага дапаможніка. Пасля запісу тэксту арганізуецца ўзаемаправерка.

**4. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 84, практ. 122. Настаўнік тлумачыць, што ў запісаных словах трэба паставіць націск.

**5. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Калі ў словах замест ***е, ё*** пішацца ***я***? Прывядзіце прыклады слоў, у якіх у першым складзе перад націскам пішацца ***я***, а ў астатніх складах ***е***. Прывядзіце прыклады слоў, у якіх у першым складзе перад націскам пішацца ***і***.

## Урок 26. Правапіс літар *е, ё — я*

***Мэты ўрока:*** пазнаёміць са словамі, якія не падпарадкоўваюцца правілу правапісу ***е, ё — я***, фарміраваць уменне правільна вымаўляць і пісаць некаторыя такія словы; адпрацоўваць вымаўленчыя навыкі, уменне вызначаць націскны склад у слове, тлумачыць правапіс слоў, працаваць з арфаграфічным слоўнікам; фарміраваць уменні: пісаць пад дыктоўку сказ; знаходзіць у сказе словы, блізкія па значэнні; рабіць узаемаправерку; пазнаёміць са слоўнікавым словам *метро*; узбагачаць слоўнікавы запас прыказкамі; развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць клапатлівыя адносіны да маці, людзей.

***Абсталяванне:*** арфаграфічны слоўнік; бутэлька кефіру;

карткі з заданнем для самастойнай работы.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

***Практыкаванне 122.***

Праверка выканання задання арганізуецца па ланцужку. Кожны вучань чытае адно слова, называе, на які склад падае націск, і тлумачыць правапіс слова. *(Вёска — вёсачка, вяско́вы. Ве́села — вясёлы, весялі́ць. Се́ні — сі́нец, сіня́ва.)*

Варта звярнуць увагу вучняў на значэнне слова *сінява* — сіні колер чаго-небудзь.

— Якая літара пішацца замест ***е, ё*** ў першым складзе перад націскам? Якая літара пішацца ў астатніх складах?

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Абмеркаванне праблемнай сітуацыі.***

Настаўнік прапануе вучням паслухаць гісторыю, якая адбылася з Чамучыкам (чытае праблемную сітуацыю на с. 84 у вучэбным дапаможніку). Настаўнік задае вучням пытанне: «Што здзівіла Чамучыка?», прапануе вучням пераканацца ў тым, што хлопчык не памыліўся, і прачытаць запіс на бутэльцы кефіру.

Настаўнік тлумачыць, што ў слове *кефір* памылкі няма.

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Настаўнік адзначае, што яны працягваюць вывучэнне тэмы мінулых заняткаў, будуць адпрацоўваць напісанне слоў з літарамі ***е, ё — я***, а таксама будуць шукаць адказ на праблемнае пытанне. Вучням прапануецца прачытаць праблемнае пытанне на с. 84 у вучэбным дапаможніку: «У якіх словах у першым складзе перад націскам захоўваецца ***е***?»

***Знаёмства са слоўнікавым словам.***

Настаўнік робіць на дошцы запіс: **МАЕАТАРАОА**. Вучням неабходна закрэсліць літару, якая сустракаецца часцей за астатнія, і расшыфраваць новае слоўнікавае слова.

— Што такое метро? *(Гарадская падземная электрычная чыгунка.)* Ці ездзілі вы калі-небудзь у метро? У чым асаблівасць гэтага віду транспартнага сродку? *(Ён вельмі хуткі.)*

— Вымавіце слова *метро*. Вымавіце слова па складах. *(*[м'э-тро]*.)* Колькі складоў у гэтым слове? *(2.)* Вымавіце слова, выдзяляючы голасам націскны склад. На які склад падае націск? *(На другі склад —* [тро]*.)*

Настаўнік запісвае слова на дошцы або вывешвае картку са слоўнікавым словам.

| метро́ |
|---|

Вучні чытаюць слова так, як яно запісана. Акцэнтуецца ўвага на тым, што ў першым складзе перад націскам захоўваецца літара ***е***. Настаўнік прапануе вучням запісаць у сшытак слова *метро*, паставіць націск, падкрэсліць ***е*** ў першым складзе.

Настаўнік тлумачыць, што ў беларускай мове ёсць словы, напісанне якіх не падпарадкоўваецца правілу правапісу ***е, ё — я***, і з некаторымі такімі словамі яны сёння пазнаёмяцца.

Настаўнік дае заданне вучням: вусна скласці сказ з новым слоўнікавым словам. Адзін сказ на выбар настаўніка можна прапанаваць запісаць з каменціраваннем.

***Практыкаванне 123.***

Настаўнік чытае скорагаворку, вучні паўтараюць за ім. Настаўнік высвятляе, ці ведаюць вучні, што такое эскалатар, прапануе разгледзець малюнак. *(Эскалатар — лесвіца з рухомымі прыступкамі для пад'ёму і спуску людзей на розныя ўзроўні.)* Варта абмеркаваць з вучнямі правілы паводзін на эскалатары. *(Пры перамяшчэнні на эскалатары трэба быць уважлівымі. Нельга бегаць, садзіцца на прыступкі. Трэба трымацца за поручань, але рэчы на яго не ставіць. Стаяць на эскалатары трэба з правага боку. Схадзіць з эскалатара трэба асцярожна, не спяшаючыся.)*

Адпрацоўваецца правільнае вымаўленне скорагаворкі. Арганізуецца конкурс на лепшага чытача скорагаворкі.

Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на выдзеленыя словы:

— Якое слоўнікавае слова сустрэлася ў скорагаворцы? *(Метро.)* Вызначце націск у гэтым слове. Якая літара пішацца ў першым складзе перад націскам? *(Літара **е**.)*

— Назавіце галосныя гукі ў слове *эскалатар*. Якая літара пішацца ў першым складзе? *(Літара **э**.)* Ці супадае напісанне слоў *метро* і *эскалатар* правілам, якія дзейнічаюць у беларускай мове?

Вучні запісваюць скорагаворку пад дыктоўку настаўніка. Затым арганізуецца ўзаемаправерка.

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Настаўнік чытае інфармацыю з рубрыкі «Важная інфармацыя» (с. 85).

— У якіх словах літара ***е*** пішацца ў першым складзе перад націскам? Прывядзіце прыклады такіх слоў. Да якога слоўніка трэба звярнуцца, каб удакладніць напісанне слоў?

**4. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 124.***

Пасля прачытання тэксту вучні расказваюць, пра што новае даведаліся, знаходзяць у тэксце словы, блізкія па значэнні. *(Метро, метрапалітэн.)* Можна арганізаваць гутарку па пытаннях:

— У якім горадзе нашай краіны пабудавана метро? Ці ведаеце вы, колькі ліній метро ў Мінску? Якія правілы паводзін у грамадскім транспарце вам вядомыя? (Асобна можна засяродзіць увагу на правілах паводзін у метро, іх можна падаць у гульнявой форме.) *(Не бегаць па платформе, не падыходзіць блізка да краю платформы, не зазіраць у тунэль. Не забягаць у дзверы цягніка, якія зачыняюцца. Падчас паездкі трымацца за поручань.)*

Тлумачэнне правапісу слоў з прапушчанымі літарамі арганізуецца франтальна. Вучань вымаўляе слова, называе, якую літару трэба ўставіць на месцы пропуску і чаму.

Перад самастойным спісваннем апошняга сказа настаўнік просіць вучняў прачытаць сказ і адказаць на наступныя пытанні:

— Колькі слоў у апошнім сказе? Як правільна афарміць сказ на пісьме? Якія словы ў сказе запісаны з вялікай літары? Чаму? Напісанне якіх слоў з гэтага сказа не адпавядае правілам, што дзейнічаюць у беларускай мове? *(Рэспубліцы, метро.)*

Пасля спісвання сказа вучні графічна абазначаюць націск у словах.

***Практыкаванне 125.***

Пасля прачытання тэксту можна правесці гутарку па пытаннях: «Як хлопчык ставіцца да сваёй матулі? Дакажыце. Што вырашыў зрабіць хлопчык? Пра што

сведчыць яго ўчынак? Як хлопчык адносіцца да іншых людзей?»

Тлумачэнне правапісу слоў і іх запіс арганізуецца па ланцужку каля дошкі. Вучань, які запісвае слова на дошцы, спачатку тлумачыць яго правапіс: «Вымаўляю слова — [захварэла]. Вызначаю націскны склад — [заха-ва-РЭ-ла]. Націск падае на трэці склад. Пад націскам пішу літару ***э***». Аналагічна арганізуецца тлумачэнне правапісу кожнага слова з прапушчанай літарай. Напісанне выдзеленых слоў вучні ўдакладняюць па арфаграфічным слоўніку. *(Тэмпература, рэцэпт.)*

***Практыкаванне 126.***

Настаўнік прапануе вызначыцца, хто будзе «пілотам», а хто — «касманаўтам». У залежнасці ад выбару вучні складаюць прыказку з дапамогай падказкі або без яе, тлумачаць яе сэнс. *(Птушка рада вясне, а дзіця — маці. Любоў роднай маці, яе клопат і пяшчоту ніхто і нішто не заменіць. Пры сонейку цёпла, пры мамцы добра. Матуля — самы лепшы, ласкавы, дарагі, блізкі і родны чалавек на свеце; побач з мамай заўсёды добра.)*

Адзін «пілот» і адзін «касманаўт» выконваюць пісьмовае заданне з адваротнага боку дошкі, усе астатнія вучні — у сшытках. Пасля выканання задання вучні параўноўваюць свой запіс з узорам на дошцы.

***Выкананне самастойнай работы.***

Кожны вучань атрымлівае картку з заданнем: «Другакласнікам неабходна падабраць словы, для правільнага напісання якіх трэба прымяніць правіла правапісу ***е, ё — я***. Хто выканаў заданне правільна?»

Адзначце [+] правільны адказ.

| ☐ Вова | ☐ Аліса | ☐ Глеб |
|---|---|---|
| радня | лядок | дзіця |
| дамашні | вясковы | лялька |
| галасы | зялёны | паляна |

**5. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 87–88, практ. 127. Настаўнік паведамляе, што загадку трэба запісаць у слупок.

**6. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Калі ў словах замест ***е, ё*** пішацца ***я***? З якім новым слоўнікавым словам пазнаёміліся на ўроку? Ці адпавядае яго напісанне правілу? Прывядзіце прыклады слоў, у якіх літара **е** захоўваецца ў першым складзе перад націскам.

## Урок 27. Зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме літарамі

***Мэта ўрока:*** актуалізаваць веды пра зычныя гукі, асаблівасці іх вымаўлення, пра літары, якімі зычныя гукі абазначаюцца на пісьме; фарміраваць уменне вызначаць зычныя гукі ў словах, адрозніваць зычныя гукі і літары для іх абазначэння на пісьме; адпрацоўваць навык правапісу вялікай літары ў словах, уменне дзяліць словы на склады, вызначаць націскны склад; выпрацоўваць уменне пісаць па памяці сказ, тлумачыць правапіс слоў; развіваць фанематычны слых, вымаўленчыя навыкі, звязнае вуснае маўленне, уменне ажыццяўляць групоўку; выхоўваць клапатлівыя адносіны да жывёл.

***Абсталяванне:*** капялюш, карткі з гукамі [дз'], [ц'], [э], [й'], [і]; веер літар.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

***Практыкаванне 127.***

Выклікаюцца тры вучні, якія выпісалі розныя загадкі. Яны чытаюць і тлумачаць устаўленыя літары. Вучні класа называюць адгадку і тлумачаць, як яе вызначылі.

— Літары якіх гукаў былі прапушчаны ў загадцы?

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Абмеркаванне праблемнай сітуацыі.***

Настаўнік выразна чытае праблемную сітуацыю. Запытваецца, ці згодныя вучні з выказваннямі Чамучыка. Як бы яны растлумачылі значэнне слоў «зычныя» і «галосныя»? Вучні выказваюць свае думкі. Настаўнік засяроджвае ўвагу на праблемным пытанні. З адказаў вучняў на яго складаецца параўнальная табліца:

| | Галосныя | Зычныя |
|---|---|---|
| Вымаўленне | Без перашкод | Перашкоды |
| Роля ў складзе | Утвараюць склад | Могуць уваходзіць у склад |

Настаўнік прапануе вымавіць адгадкі з дамашняга задання і назваць у іх зычныя гукі.

— Растлумачце, як вы здагадаліся, што гэта зычныя гукі.

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

— Як вы думаеце, якія гукі мы пачнём вывучаць?

***Практыкаванне 128.***

Вучні тлумачаць, па якой прымеце падзелены гукі ў воблаках. Потым называюць гукі з капелюша і «змяшчаюць» у адпаведнае воблака. Пажадана арганізаваць гэтую працу на дошцы, дзе замацаваны два малюнкі воблакаў (розных па форме). На стале настаўніка знаходзіцца капялюш. Выкліканы вучань імітуе, што дастае з капелюша гук. У гэты час настаўнік называе яму гук шэптам. Вучань знаходзіць адпаведную картку, вымаўляе гук уголас, дае яму характарыстыку (зычны ці галосны) і замацоўвае на адпаведным воблаку. Пасля выканання задання яшчэ раз трэба назваць зычныя гукі і паказаць адпаведныя літары з воблака. Потым мэтазгодна паўтарыць, чым зычныя гукі адрозніваюцца ад галосных. Настаўнік прапануе палічыць па алфавіце на форзацы, колькі літар выкарыстоўваецца для абазначэння зычных гукаў.

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Настаўнік чытае правіла і дае вучням заданне вызначыць, пра што яшчэ не сказалі, калі характарызавалі зычныя гукі. Вучні чытаюць правіла самастойна напаўголаса. Прыводзяць свае прыклады зычных гукаў, якіх няма ў правіле.

**4. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 129.***

Настаўнік прапануе разгледзець слупкі з літарамі і цікавіцца, што заўважылі вучні. Вучні выказваюць свае меркаванні і прыводзяць аргументы.

— Па літарах якога слупка лягчэй здагадацца пра словы?

Настаўнік прапануе сумясціць гэтыя літары і назваць словы, якія атрымаліся. Далей вучні з каменціраваннем запісваюць атрыманыя словы, падкрэсліваюць літары, якія абазначаюць зычныя гукі.

Запісаныя словы і малюнак да практыкавання з'яўляюцца асновай для стварэння вучнямі вуснага

выказвання. Лепш за ўсё арганізаваць працу, у выніку якой атрымаецца звязнае выказванне, напрыклад, на тэму «Выпадак на дарозе». Для арганізацыі такой работы ў залежнасці ад падрыхтаванасці вучняў класа можна прапанаваць апорныя словы і словазлучэнні, дадатковыя малюнкі. Можна арганізаваць абмен уражаннямі вучняў, якія ездзілі з бацькамі на аўтамабілі.

***Практыкаванне 130.***

Настаўнік прапануе вучням самастойна прачытаць і адгадаць загадку. Калі вучні назавуць адгадку «кот», настаўнік тэатральна здзіўляецца і не пагаджаецца з імі, таму што на малюнку ёсць мышка. Мабыць, адгадка «мышка». Просіць вучняў знайсці і прачытаць радкі загадкі, што даказваюць выбар адгадкі «кот».

Работа па супастаўленні выдзеленых слоў і гукавых схем пачынаецца з выразнага вымаўлення слоў і вызначэння ў іх паслядоўнасці гукаў. Кожнаму гуку даецца характарыстыка. На падставе гукавога аналізу слоў вызначаюцца схемы. Можна прыгадаць, чаму зычныя гукі ў схемах абазначаюцца сінім і зялёным колерамі.

Пасля адпаведнай падрыхтоўкі па памятцы на форзацы вучні запісваюць першы сказ. У працэсе падрыхтоўкі да спісвання трэба звярнуць увагу на словы, якія адрозніваюцца адным гукам, даць ім характарыстыку (зычныя). Таксама трэба акцэнтаваць увагу вучняў на пачатак пісьма з вялікай літары і пастаноўку пытальніка ў канцы сказа. Пры тлумачэнні правапісу прапушчаных літар трэба прыгадаць адпаведныя правілы.

***Практыкаванне 131.***

Работа над практыкаваннем пачынаецца з мэтанакіраванага разглядвання малюнка. Вучні адказваюць на пытанні настаўніка: «Якія свойскія жывёлы пасвіліся на лузе? У каго з іх былі мянушкі? Як звалі казу? Казла? Парсючка?»

Арганізуецца чытанне тэксту ўголас. Перад чытаннем тэксту трэба з вучнямі вызначыць, што значыць «дубец», «вербалоз», «галінка». Можна іх прадэманстраваць вучням. У працэсе чытання вучні дапаўняюць тэкст патрэбнымі мянушкамі. Для таго каб вучні адказалі, хто з жывёл на малюнку не ўпамінаецца ў тэксце, можна прапанаваць прачытаць тэкст яшчэ раз самастойна.

Вучні чытаюць тэкст па частках (абзацах). Расказваюць, пра што гаворыцца ў кожнай частцы. Для пераказу трэцяй часткі вызначаюцца важныя словы, арыентуючыся на іх вучні пераказваюць гэтую частку. Можна арганізаваць пераказ часткі па пытаннях, калі да кожнага сказа задаецца пытанне і адказы на пытанні з'яўляюцца пераказаным тэкстам:

1. Дзе часам жанчына пасвіць сваю жывёлу? *(На беразе рэчкі.)*
2. Што яна робіць на беражку? *(Сядзіць ды галінкай камароў адганяе.)*
3. Што там робіць парсючок? *(У пясочку качаецца.)*
4. Што там робяць казёл з казою? *(Вербалоз аб'яддаюць.)*

Можна прапанаваць пытанні без апорных слоў для адказу (у дужках). Усе адказы вучняў на пытанні павінны быць поўнымі і разгорнутымі.

Вучні самастойна выпісваюць словы з прапушчанымі літарамі. Правяраюць выкананне работы шляхам узаемаправеркі ў парах. Для кантролю правільнасці франтальна вызначаюцца ўстаўленыя літары з дапамогай веера літар. Вучні называюць двухскладовыя словы сярод запісаных. Паўтараюць, як вызначыць колькасць складоў у слове. Потым падкрэсліваюць у гэтых словах літары, якія абазначаюць зычныя гукі.

Апошняе заданне практыкавання накіравана на паўтарэнне правілаў ужывання вялікай літары, якое прыгадваюць вучні. Яны выпісваюць назвы жывёл з іх мянушкамі.

**5. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 92, практ. 132. Трэба прачытаць скорагаворку і растлумачыць выраз «след у след».

**6. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Якую тэму разглядалі? Чым зычныя гукі адрозніваюцца ад галосных?

## Урок 28. Вымаўленне і правапіс слоў з ў

***Мэты ўрока:*** актуалізаваць веды пра гукі [у], [ў] і літары, якімі яны абазначаюцца на пісьме; пазнаёміць з правілам правапісу ***ў***, адпрацоўваць уменне яго прымяняць; развіваць фанематычны слых, вымаўленчыя навыкі; выпрацоўваць уменне пісаць па памяці, тлумачыць правапіс слоў; узбагачаць слоўнікавы запас назвамі прафесій; развіваць звязнае вуснае маўленне; выхоўваць клапатлівыя адносіны да птушак.

***Абсталяванне:*** фотаздымак з помнікам літары ***ў*** у Полацку; малюнкі, на якіх адлюстраваны кавун, шпакоўня, птушкі калібры, голуб, кнігаўка, малінаўка, ластаўка, бусел, жураваль; карткі са словамі *гол..б, кніга..ка, маліна..ка, ласта..ка, б..сел, ж..равель.*

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

***Практыкаванне 132.***

Спачатку адзін вучань услых чытае скорагаворку. Затым праводзіцца конкурс на лепшага чытача скорагаворкі.

— Як вымаўляюцца зычныя гукі? Чым адрозніваюцца зычныя гукі ад галосных? Назавіце зычныя гукі.

Арганізуецца ўзаемаправерка выкананага пісьмовага задання.

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Абмеркаванне праблемнай сітуацыі.***

Настаўнік прапануе вучням паслухаць гісторыю пра Чамучыка (чытае праблемную сітуацыю на с. 92).

Вучні вымаўляюць гукі [у] і [ў], адзначаюць розніцу ў іх вымаўленні.

— Успомніце, якая розніца паміж гукамі [у] і [ў]. Які з гукаў галосны, а які — зычны? Якой літарай на пісьме перадаецца гук [у]? А гук [ў]? Ці ведаеце вы, калі пішацца літара ***ў***?

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Настаўнік аб'яўляе тэму ўрока: «Вымаўленне і правапіс слоў з ***ў***»; адзначае, што на ўроку вучні будуць практыкавацца ў вымаўленні слоў з гукамі [у] і [ў]; даведаюцца, калі ў словах пішацца літара ***ў***; будуць на пісьме прымяняць правіла правапісу ***ў***.

***Практыкаванне 133.***

Вучні разглядваюць малюнкі, называюць прафесіі людзей. *(Настаўнік, будаўнік, кухар, цырульнік, касманаўт.)* Вучні звяртаюцца да тлумачальнага слоўніка ў канцы вучэбнага дапаможніка для ўдакладнення значэння слоў *кухар, цырульнік*; называюць прафесію, для якой існуе яшчэ адна назва. *(Кухар, повар.)*

Настаўнік арганізуе гутарку пра важнасць, запатрабаванасць кожнай прафесіі.

— Назавіце яшчэ раз прафесіі. У якіх словах вымаўляецца гук [у]? *(Б*[у]*даўнік, к*[у]*хар, цыр*[у]*льнік.)* У якіх словах вымаўляецца гук [ў]? *(Наста*[ў]*нік, буда*[ў]*нік, касмана*[ў]*т.)* Назавіце слова, у якім ёсць гукі [у] і [ў]. *(Б*[у]*да*[ў]*нік.)*

Выкананне пісьмовага задання арганізуецца з каменціраваннем на дошцы. Вучні запісваюць словы з **ў**, падкрэсліваюць літару перад **ў**. Пасля запісу слоў настаўнік цікавіцца ў вучняў, ці могуць яны адказаць на пытанне: «Калі ў словах пішацца літара **ў**?» (Вучні самастойна фармулююць правіла.)

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Настаўнік прапануе пераканацца ў правільнасці зробленага вываду і прачытаць інфармацыю з рубрыкі «Трэба ведаць» (с. 93).

— Якой літарай на пісьме абазначаецца гук [ў]? Калі пішацца літара **ў**? Ці ведаеце вы, у якім горадзе ўстаноўлены помнік літары **ў**?

Настаўнік расказвае, што ў горадзе Полацку ў 2003 годзе быў устаноўлены помнік 22-й літары беларускага алфавіта — літары **ў**. Помнік адначасова з'яўляецца сонечным гадзіннікам. Вучні разглядваюць фотаздымак з помнікам літары **ў**, расказваюць, як ён выглядае.

***Практыкаванне 134.***

Вучні вызначаюць, хто будзе «пілотам», а хто — «касманаўтам». У залежнасці ад гэтага знаходзяць словы ў ланцужку складоў (спачатку самастойна). Затым вучні вымаўляюць словы, запісваюць словы з **ў**, падкрэсліваюць **ў** разам з папярэдняй літарай. («Пілоты»: *красоўкі, кіраўнік, сяброўка, аўтобус*. «Касманаўты»: *садоўнік, шпакоўня, вяроўка.*)

Выкананне задання арганізуецца на дошцы: некалькі «пілотаў» і «касманаўтаў» паслядоўна запісваюць словы на дошцы, тлумачаць іх правапіс.

Падчас запісу слоў пажадана звяртаць увагу і на іх значэнне. Варта растлумачыць значэнне слова *кавун* і *шпакоўня*; тлумачэнне слоў сумясціць з паказам адпаведных малюнкаў.

***Практыкаванне 135.***

Настаўнік чытае скорагаворку. Удакладняе ў вучняў, ці разумеюць яны значэнне слова *клін. (Клін — тое, што мае трохвугольную, завостраную з аднаго боку форму.)* Можна прапанаваць вучням яшчэ раз разгледзець жураўліны клін на с. 15 вучэбнага дапаможніка. Арганізуецца адпрацоўка правільнага вымаўлення скорагаворкі. Некалькі вучняў расказваюць скорагаворку на памяць.

— Колькі сказаў уключае скорагаворка? Як правільна аформіць сказ на пісьме? Колькі слоў у гэтым сказе?

— Вымавіце словы з прапушчанымі літарамі. У якіх словах на месцы пропускаў вы вымаўлялі гук [ў]? *(Жураўлі, поўдзень, плаўна.)* Якой літарай гэты гук трэба абазначыць на пісьме? *(Літарай **ў**.)* Калі пішацца літара **ў**?

Кожны вучань самастойна запісвае скорагаворку па памяці, падкрэслівае літару **ў**.

**4. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 136.***

Адзін з вучняў чытае тэкст услых, а астатнія сочаць. Вучні расказваюць, пра што цікавае даведаліся. У тым выпадку, калі ў вучняў узнікнуць цяжкасці пры ўзнаўленні зместу тэксту, можна арганізаваць гутарку па пытаннях:

— Якая птушка самая маленькая ў нашай краіне? Чаму гэта птушка мае такую назву? Разгледзьце малюнак. Апішыце, як выглядае птушка. Чаму жоўтагаловага каралька яшчэ называюць паўночным калібры? *(Калібры — самая дробная птушка на Зямлі.)* Ці ведаеце вы, як выглядае калібры. (Настаўнік паказвае малюнак, на якім адлюстравана птушка калібры.)

Настаўнік прапануе вучням вымавіць словы з літарамі, закрытымі сонейкам. Вучань, які называе слова, запісвае яго на дошцы і тлумачыць правапіс. Астатнія вучні запісваюць словы ў сшытках. Такім чынам паслядоўна арганізуецца тлумачэнне правапісу кожнага слова.

— Знайдзіце ў тэксце сказ, які змяшчае пытанне, і прачытайце яго з адпаведнай інтанацыяй. *(Якая птушка самая маленькая ў Беларусі?)* Колькі слоў у гэтым сказе? Якія словы запісаны з вялікай літары? Чаму? Адкажыце на пытанне з тэксту.

Кожны вучань самастойна спісвае пытанне і адказ на яго.

***Калектыўнае выкананне задання на дошцы.***

Настаўнік размяшчае на дошцы малюнкі і карткі са словамі:



б..сел
ж..равель
кніга..ка
маліна..ка
ласта..ка
гол..б



Вучні выконваюць наступныя заданні і адказваюць на пытанні:

— Прачытайце словы. Якія літары прапушчаны ў словах? Растлумачце іх правапіс. (Вучні маркерам дапісваюць прапушчаныя літары на картках.) Знайдзіце кожную птушку на малюнку. (Вучні перамяшчаюць карткі са словамі да адпаведных малюнкаў.)

Настаўнік цікавіцца, ці бачылі вучні названых птушак, дзе і калі гэта было. У працэсе гутаркі вучні расказваюць, як людзі могуць дапамагчы птушкам зімой.

**5. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 95, практ. 137. Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на тое, што верш трэба запісаць у слупок; літары **у** і **ў** трэба пісаць без дужак.

**6. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Чым адрозніваюцца гукі [у] і [ў]? Ахарактарызуйце гук [ў]. Якой літарай на пісьме абазначаецца гук [ў]? Калі пішацца літара **ў**?

## Урок 29. Вымаўленне і правапіс слоў з ў

***Мэты ўрока:*** адпрацоўваць уменне прымяняць правіла правапісу **ў**; пазнаёміць з выпадкамі, у якіх не пішацца **ў**; адпрацоўваць уменне дзяліць для пераносу словы з літарай **ў**, вызначаць націск у словах; узбагачаць слоўнікавы запас назвамі ягад, прыказкамі; фарміраваць уменне падбіраць словы, блізкія па значэнні, да прапанаваных слоў; пазнаёміць са слоўнікавым словам *сябар*; развіваць фанематычны слых, звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць цікавасць да навакольнага асяроддзя.

***Абсталяванне:*** малюнкі, на якіх адлюстраваны месяц (маладзік, поўня); картка са слоўнікавым словам *сябар*.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

***Практыкаванне 137.***

Адзін вучань услых чытае верш. Вучні расказваюць, які малюнак уявілі, калі чыталі верш, апісваюць, як змяніўся месяц. *(Спачатку быў круглым, а потым стаў, як сярпок.)* Настаўнік паказвае малюнкі, на якіх адлюстраваны маладзік, поўня.

— Калі ў словах пішацца літара **ў**?

Праверка выкананага пісьмовага задання праводзіцца франтальна: вучні называюць словы, тлумачаць, якую літару ўставілі. *(Пахудзеў, стаў, ранку, слухаў, калыханку.)*

**3. Этап знаёмства са слоўнікавым словам.**

Настаўнік робіць на дошцы запіс і прапануе вучням расшыфраваць слоўнікавае слова: лічба ўказвае на парадкавы нумар літары ў алфавіце.

| 19 | 32 | 2 | 1 | 18 |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

— Каго можна назваць сябрам? Якімі якасцямі валодае сапраўдны сябар? Ці шмат сяброў у вас? Як вы праводзіце час разам з сябрамі?

— Вымавіце слова *сябар*. Падзяліце слова на склады. *(*[с'а-бар]*.)* Колькі складоў у гэтым слове? *(2.)* Вымавіце слова, выдзяляючы голасам націскны склад. На які склад падае націск? *(На першы склад —* [с'а]*.)* Назавіце гукі па парадку. *(*[с'] [а] [б] [а] [р]*.)* Колькі галосных гукаў у слове? Якія? *(Два галосныя гукі* [а]*.)*

Настаўнік запісвае слова на дошцы або вывешвае картку са слоўнікавым словам.

| сябар |

Вучні чытаюць слова так, як яно запісана. Вызначаюць, ці супадае вымаўленне і напісанне слова.

Вучні запісваюць у сшытак слова *сябар*, ставяць націск, падкрэсліваюць літару ***а***.

Настаўнік прапануе вучням скласці сказ са словам *сябар*. Адзін сказ на выбар настаўніка можна прапанаваць запісаць.

**4. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 138.***

Вучні чытаюць прыказкі ўслых, вызначаюць, на якую яны тэму, і тлумачаць іх сэнс. *(Прыказкі на тэму сяброўства. У бядзе сябра пазнаюць. Сапраўдны сябар не кіне ў цяжкую хвіліну, заўсёды прыйдзе на дапамогу. Не май сто рублёў, а май сто сяброў. Часта сябры даражэйшыя за багацце. Так кажуць, калі сябры або знаёмыя выручаюць у бядзе, дапамагаюць.)*

Вучні знаходзяць у прыказках словы з літарай **ў**, тлумачаць іх правапіс.

Кожны вучань самастойна запісвае другую прыказку ў сшытак. Можна прадугледзець каменціраванае пісьмо.

***Практыкаванне 139.***

Пасля прачытання сказаў арганізуецца тлумачэнне правапісу слоў:

— Прачытайце словы з літарай **ў**. Растлумачце іх правапіс. *(Прыехаў, напісалі ў, стаў.)* У якіх словах літара **ў** не пішацца пасля галосных? *(Уладзіміра, Улада, упарты, Ушачы.)* Як запісаны словы *Уладзімір*, *Улада*, *Ушачы*? *(Словы запісаны з вялікай літары.)* Які вывад можна зрабіць, калі не пішацца літара **ў** пасля галосных? Ці здагадаліся вы, чаму ў слове *упарты* напісана літара **у**? Які знак прыпынку стаіць перад гэтым словам? *(Коска.)* Зрабіце вывад, калі ў словах не пішацца **ў** пасля галосных?

Вучні самастойна спісваюць першы сказ, у слоўнікавым слове *сябар* ставяць націск, падкрэсліваюць літары галосных гукаў. *(Сябар.)* Адзін вучань каля дошкі дзеліць для пераносу слова *пры-ехаў* (*прые-хаў*).

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Настаўнік адзначае, што яны працягваюць вывучэнне тэмы мінулых заняткаў, будуць адпрацоўваць напісанне слоў з **ў**, а таксама даведаюцца, калі літара **ў** не пішацца пасля галосных.

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Адзін вучань услых чытае інфармацыю з рубрыкі «Важная інфармацыя» (с. 96), астатнія сочаць па вучэбным дапаможніку.

— Калі літара **ў** не пішацца пасля галосных?

Настаўнік прапануе вучням разгледзець апошнюю схему на форзацы 2 і расказаць правіла правапісу **ў**.

**5. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 140.***

Вучні разглядваюць малюнкі, чытаюць назвы ягад. Пасля чаго адказваюць на пытанні настаўніка: «Якія ягады каштавалі? Якія ягады найбольш падабаюцца? Якія іншыя назвы ягад вы ведаеце? Ці збіралі калі-небудзь ягады? Калі гэта было? Якія правілы збору ягад трэба выконваць?»

Затым настаўнік чытае верш, а вучні сочаць за ім па вучэбным дапаможніку і хорам прагаворваюць назвы ягад замест адпаведных малюнкаў.

— Якімі словамі, блізкімі па значэнні, можна замяніць выдзеленае слова? *(Сябрукі — сябры, таварышы.)*

Працу па тлумачэнні правапісу слоў можна правесці наступным чынам: вучань называе слова з выбарам літары ў дужках, тлумачыць яго правапіс; калі ў слове трэба запісаць літару **ў**, вучань запісвае яго на дошцы, падзяляючы для пераносу. Усе астатнія вучні запісваюць слова ў сшытках. Такім чынам праводзіцца праца з кожным словам. *(Збі-раў, ез дзіў, на-заў-тра (на-заўт-ра).*

— Назвы якіх членаў сям'і сустрэліся ў вершы? Назавіце гэтыя словы ў алфавітным парадку.

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Настаўнік чытае інфармацыю з рубрыкі «Важная інфармацыя» (с. 98), звяртае ўвагу на правільнае ўжыванне назоўнікаў *тата*, *дзядуля*, *мама*, *бабуля* ў форме творнага склону.

***Практыкаванне 141.***

Вучні спачатку чытаюць тэкст самастойна, а потым услых; расказваюць, пра што даведаліся. У тым выпадку, калі вучням будзе складана самастойна ўзнавіць змест тэксту, можна правесці гутарку па пытаннях: «Як да зімы рыхтуецца мядзведзь? Як праводзяць сябе лісіцы? Якія жывёлы мяняюць футра на зімовае? Чаму? Калі адлятаюць на поўдзень апошнія дзікія качкі?»

Тлумачэнне правапісу слоў з прапушчанымі літарамі праводзіцца франтальна. *(Месяц, восені, у бярлогу, мядзведзь, змянілі, белякі, адлятаюць.)*

Узор тлумачэння вучня: «Вымаўляю слова *месяц*. Пасля літары ***с*** пішу ***я***. Слова *месяц* — слоўнікавае, яго напісанне трэба запомніць».

Затым вучні тлумачаць правапіс літар «у берэтах». Самастойна спісваюць выдзеленыя сказы, падкрэсліваюць ***ў*** разам з папярэдняй літарай.

**6. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 99, практ. 142. Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на тое, што прозвішча аўтара спісваць не трэба.

**7. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Прывядзіце прыклады слоў з гукам [ў]. Прадоўжыце сказы: *Літара* ***ў*** *пішацца ... . Літара* ***ў*** *не пішацца ... .*

## Урок 30. Вымаўленне і правапіс слоў з *ў*

***Мэты ўрока:*** адпрацоўваць уменне правільна пісаць словы з ***ў***; пазнаёміць з некаторымі словамі, правапіс якіх не падпарадкоўваецца правілу правапісу ***ў***; адпрацоўваць уменне вызначаць націск у словах, размяшчаць словы ў алфавітным парадку; узбагачаць слоўнікавы запас назвамі рыб; пазнаёміць са слоўнікавым словам *акварыум*; развіваць фанематычны слых, мысленне, уменне рабіць апісанне з апорай на малюнак; выхоўваць клапатлівыя адносіны да жывёл.

***Абсталяванне:*** картка са слоўнікавым словам *акварыум*; малюнкі двух акварыумаў; карткі ў выглядзе рыбак са словамі *аквары..м*, *пла..нік*, *рыбало..*, *в..да*, *кр..чок*, *уло..*; малюнак, на якім адлюстраваны вугор; карткі з заданнем для самастойнай работы.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

***Практыкаванне 142.***

Можна правесці конкурс на лепшага чытача скорагаворак.

Праверка пісьмовага задання праводзіцца франтальна. Вучні чытаюць скорагаворкі і тлумачаць правапіс слоў. *(Малы Улас улез у гразь. (А. Клышка.) Улетку Ульяна пайшла на паляну.)*

— Калі пішацца літара ***ў***? Калі літара ***ў*** не пішацца пасля галосных?

**3. Этап знаёмства са слоўнікавым словам.**

Настаўнік робіць на дошцы запіс і прапануе вучням расшыфраваць слоўнікавае слова.

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 5 | 2 | 8 | 6 | 4 | 3 | 1 | 7 |
| р | к | м | ы | а | в | а | у |

Настаўнік цікавіцца, ці ведаюць вучні, што такое акварыум. *(Шкляная пасудзіна з вадой для трымання рыб, іншых водных жывёлін і раслін.)*

— Вымавіце слова *акварыум*. Падзяліце слова на склады. *(*[а-ква-ры-ум]*.)* Колькі складоў у гэтым слове? *(4.)* Вымавіце слова, выдзяляючы голасам націскны склад. На які склад падае націск? *(На другі склад —* [ква]*.)* Назавіце гукі па парадку. *(*[а] [к] [в] [а] [р] [ы] [у] [м]*.)*

Настаўнік запісвае слова на дошцы або вывешвае картку са слоўнікавым словам.

акварыум

Вучні чытаюць слова так, як яно запісана. Вызначаюць, ці супадае вымаўленне і напісанне слова. Настаўнік задае пытанні:

— Што вы можаце сказаць пра напісанне гэтага слова? Ці адпавядае яно правілу правапісу ***ў***? *(Пасля літары галоснага гука напісана літара* ***у****, а не* ***ў****.)*

Настаўнік тлумачыць, што ў беларускай мове ёсць словы, напісанне якіх не падпарадкоўваецца правілу правапісу ***ў***, і з некаторымі такімі словамі яны сёння пазнаёмяцца.

Вучні запісваць у сшытак слова *акварыум*, ставяць націск, падкрэсліваюць літару ***у***. Настаўнік прапануе вучням скласці сказ са словам *акварыум*.

**4. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 143.***

Вучні чытаюць сказы і дапаўняюць іх патрэбнымі словамі. Настаўнік задае пытанне: «Якія асаблівасці правапісу ***у*** вы заўважылі ў словах, якімі дапаўнялі сказы?» Вучні адзначаюць, што напісанне слоў не падпарадкоўваецца правілу правапісу ***ў***.

Выкананне пісьмовага задання арганізуецца на дошцы. Вучні запісваюць словы ў тым парадку, у якім яны павінны быць у сказах. *(Акварыум, акварыуміст, гурамі, ляліус, акварыумныя.)*

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Настаўнік паведамляе, што яны працягваюць вывучаць тэму «Вымаўленне і правапіс слоў з ***ў***»; будуць адпрацоўваць напісанне слоў з ***ў***, а таксама даведаюцца, у якіх словах ***ў*** не пішацца пасля галосных.

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Настаўнік чытае інфармацыю з рубрыкі «Важная інфармацыя» (с. 100).

— Калі літара ***ў*** не пішацца пасля галосных? Прывядзіце прыклады такіх слоў. Да якога слоўніка трэба звярнуцца, каб удакладніць напісанне слоў?

***Заданне «Перамясціце рыбку ў акварыум».***

Настаўнік вывешвае на дошцы малюнкі з двума акварыумамі і карткі ў выглядзе рыбак з прапушчанымі літарамі.

— Перамясціце кожную рыбку ў свой акварыум. Растлумачце выбар.




Выкананне задання арганізуецца наступным чынам: вучань вымаўляе слова, тлумачыць яго правапіс і перамяшчае рыбку ў адпаведны акварыум. *(Акварыум, вуда, кручок. Плаўнік, улоў, рыбалоў.)*

***Практыкаванне 144.***

Пасля прачытання верша вучні тлумачаць правапіс слоў з выбарам літар. *(Акварыум, група.)* Настаўнік яшчэ раз засяроджвае ўвагу вучняў на тым, што напісанне слова *акварыум* трэба запомніць (гэта слоўнікавае слова).

Кожны вучань самастойна спісвае першы сказ, у слоўнікавым слове графічна абазначае націск, падкрэслівае літары, якія абазначаюць галосныя гукі.

Пасля выканання пісьмовага задання настаўнік прапануе вучням разгледзець малюнак і апісаць, як выглядаюць рыбкі.

Настаўнік цікавіцца, ці ёсць у каго-небудзь з вучняў дома акварыум з рыбкамі, якія рыбкі там жывуць, як вучні клапоцяцца пра іх.

**5. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 145.***

Вучні чытаюць тэкст, пасля чаго праводзіцца гутарка па пытаннях: «Што Паўлік атрымаў у падарунак ад таты? Якія словы з тэксту пацвярджаюць, што Паўлік клапатлівы? Што пра рыбак расказаў тата?»

Настаўнік прапануе вучням разгледзець малюнак і расказаць, як рыбкі прадказваюць надвор'е. *(Рыбкі — добрыя сіноптыкі. Яны прадказваюць надвор'е сваімі паводзінамі. У сонечны дзень рыбкі падплываюць бліжэй да паверхні вады. Перад пагаршэннем надвор'я трымаюцца бліжэй да дна.)*

Тлумачэнне правапісу слоў арганізуецца наступным чынам. Вучні вымаўляюць словы, у якіх літары закрыты рыбкамі. Называюць гукі, якія вымаўлялі на месцы рыбкі, і тлумачаць, якімі літарамі іх трэба абазначыць на пісьме.

***Практыкаванне 146.***

Спачатку вучні разглядваюць малюнкі і чытаюць назвы рыб. Затым чытаюць тэкст, дапаўняючы выдзелены сказ назвамі рыб у патрэбнай форме. *(Калі бераг гліністы, можна сустрэць судака, шчупака, галаўня.)* Настаўнік задае пытанні:

— Як вы думаеце, для каго будзе карысней інфармацыя, пададзеная ў тэксце? Чаму? *(Інфармацыя будзе карыснай для рыбакоў, для тых, хто займаецца вывучэннем рыб.)*

Праца па тлумачэнні правапісу слоў з **у** і **ў** праводзіцца франтальна.

Затым настаўнік прапануе вучням яшчэ раз прачытаць назвы рыб і размясціць іх у алфавітным парадку. *(Галавень, судак, шчупак.)* Кожны вучань запісвае выдзелены сказ у сшытак, адзін вучань каменціруе ўслых.

***Выкананне самастойнай работы.***

Кожны вучань атрымлівае картку з заданнем (тэкст з кнігі «Дзіцячы атлас Беларусі» [2, с. 17]):

> Прачытайце тэкст. Закрэсліце лішнія літары ў дужках.
>
> Самая незвычайная рыба (у/ў) Беларусі — вугор з до(у/ў)гім, як (у/ў) змяі, целам і пляскатай галавой. Калі ты паспраб(у/ў)еш яго (у/ў)хапіць, на(у/ў)рад ці (у/ў)трымаеш (у/ў) руках: цела вугра пакрыта то(у/ў)стым слоем слізі. Ён д(у/ў)жы, вёрткі і даволі цяжкі. Дарослая рыбіна важыць да 4 кілаграма(у/ў) і мае да(у/ў)жыню да 2 метра(у/ў).

Настаўнік паказвае на малюнку, як выглядае вугор. Праверка задання ажыццяўляецца настаўнікам.

**6. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 102, практ. 147.

**7. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Калі пішацца літара **ў**? Калі яна не пішацца пасля галосных? З якім слоўнікавым словам пазнаёміліся на ўроку? Ці адпавядае напісанне гэтага слова правілу правапісу **ў**? Назавіце іншыя словы, правапіс якіх не падпарадкоўваецца гэтаму правілу.

## Урок 31. Цвёрдыя і мяккія зычныя гукі

***Мэта ўрока:*** актуалізаваць веды пра цвёрдыя і мяккія зычныя гукі (парныя і няпарныя); фарміраваць уменне адрозніваць цвёрдыя і мяккія зычныя гукі ў слове і правільна перадаваць іх на пісьме; адпрацоўваць уменне дзяліць слова на склады, вызначаць націск; развіваць фанематычны слых, вымаўленчыя навыкі, уменне працаваць са схемамі; узбагачаць слоўнікавы запас назвамі посуду; развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць цікавасць да вывучэння беларускай мовы.

***Абсталяванне:*** літары разразной азбукі і наборнае палатно; пяльцы, збан, торба.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

Настаўнік запытваецца ў вучняў пра **ў**: калі пішацца гэта літара, які гук абазначае. Прапануе даць яго характарыстыку з апорай на алфавіт на форзацы (зычны, звонкі, цвёрды).

***Практыкаванне 147.***

Дамашняе заданне правяраецца шляхам узаемаправеркі.

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Абмеркаванне праблемнай сітуацыі.***

Настаўнік выразна чытае тэкст праблемнай сітуацыі да слоў «Прачытаў для праверкі...» і спыняецца, каб запытацца: «Як вы думаеце, якое слова пісаў Чамучык?» Выслухоўвае меркаванні дзяцей і дачытвае тэкст да праблемнага пытання. Вучні адказваюць на пытанні, якія прагучалі. Выкладваюць словы КЛОН і КЛЁН з літар разразной азбукі на наборным палатне:

— Якімі гукамі адрозніваюцца словы? Ахарактарызуйце іх.

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Вучні хорам чытаюць праблемнае пытанне. Спрабуюць адказаць на яго. Вызначэнне тэмы ўрока і чытанне яе ў падручніку.

— Што будзем даследаваць на ўроку?

***Практыкаванне 148.***

Выкананне заданняў практыкавання трэба пачаць з вызначэння слоў, якія называюць намаляваныя прадметы. Пра значэнне слова *пяльцы* вучні даведваюцца з тлумачальнага слоўніка, змешчанага ў канцы вучэбнага дапаможніка. Пажадана паказаць вучням сапраўдныя пяльцы.

Варта ўжо на гэтым этапе выканаць заданне па складанні сказаў з гэтымі словамі з дапамогай прыёму «Пантаміма». Настаўнік ці вучні паказваюць якое-небудзь дзеянне з прадметам. Астатнія распазнаюць яго і запісваюць сказ, які атрымаўся. Напрыклад, настаўнік узяў крэйду, потым паклаў яе і паказаў белыя пальцы. Вучні складаюць сказ: *Пасля крэйды пальцы сталі белыя.* Настаўнік імітуе вышыўку на пяльцах. Вучні складаюць сказ: *Настаўніца вышывае на пяльцах.*

Пасля выразнага вымаўлення слоў трэба вызначыць гукі, якімі яны адрозніваюцца. Пажадана пабудаваць на дошцы гукавыя схемы гэтых слоў. Вызначыць, якімі гукамі яны адрозніваюцца, і ахарактарызаваць гэтыя гукі. Пасля гэтага трэба абазначыць гукі адпаведнымі літарамі. Звяртаецца ўвага, што цвёрдасць

зычнага гука перадаецца літай ***а***, а мяккасць зычнага гука — літарай ***я***. Пасля правядзення такой падрыхтоўчай работы вучні запісваюць словы ў сшыткі, падкрэсліваюць літары, якімі яны адрозніваюцца.

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Далей адбываецца работа з правілам на с. 104. Пасля самастойнага чытання правіла вучнямі настаўнік прапануе заданне «Дапоўні выказванні», падрыхтаванае на дошцы:

Гукі бываюць *(фішка галоснага гука)* і __________.

__________ бываюць *(фішка цвёрдага зычнага)* і *(фішка мяккага зычнага)*.

*(Фішка цвёрдага зычнага)* абазначаецца на пісьме літарамі __, __, __, __, __ .

*(Фішка мяккага зычнага)* абазначаецца на пісьме літарамі __, __, __, __, __, _ .

***Практыкаванне 149.***

Разгляд схемы арганізуецца настаўнікам наступным чынам:

— Якія літары напісаны на блакітным полі са стрэлкай? Пра што яны гавораць? На якія гукі паказвае стрэлка? (Аналагічна з літарамі на ружовым полі са стрэлкай.) Чаму ў верхнім радзе гукі закрыты сухарамі, а ў ніжнім — пончыкамі?

У выпадку, калі ніхто з вучняў не здагадаўся, трэба працягваць работу наступным чынам:

— Знайдзіце і прачытайце, якія гукі абазначае літара ***б***. Якімі літарамі галосных гукаў абазначаецца цвёрдасць гука [б], мяккасць гука [б']? (Аналагічна для літары ***х***.) Знайдзіце літару ***з***. Які мяккі гук яна абазначае, паглядзіце па зялёнай стрэлачцы. А цяпер па сіняй стрэлачцы скажыце, які адпаведны гук закрыты сухаром? Які ён: цвёрды ці мяккі? Вымавіце гук правільна. Якімі літарамі трэба абазначыць цвёрдасць гука [з]? І г. д.

Напрыканцы працы вучні павінны назваць зычныя гукі, якія ўтвараюць пары па цвёрдасці — мяккасці.

**4. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 150.***

Пасля работы над значэннямі слоў, якія называюць прадметы на малюнках, праводзіцца гукавы аналіз слоў. Вызначаюцца словы з толькі цвёрдымі зычнымі. Вучні называюць літары, якія абазначаюць цвёрдасць кожнага зычнага гука.

Работу па пошуку слоў, якія адпавядаюць схемам, можна арганізаваць у групах па тры вучні (тры вучні выклікаюцца да дошкі). Вучні ў групах і каля дошкі дамаўляюцца, хто з якой схемай будзе працаваць. Пасля выканання задання вучні, якія працавалі каля дошкі, адказваюць на пытанні вучняў класа пра колькасць галосных і зычных гукаў, абазначэнне мяккасці і цвёрдасці зычных гукаў, колькасць складоў і месца націску, варыянты пераносу слоў.

***Практыкаванне 151.***

Настаўнік арганізуе гульню «Пазнай прадмет». У цёмную торбу з тканіны, якая не прасвечваецца, пакладзены збан. Выкліканы вучань ці вучні абмацваюць прадмет і выказваюць меркаванні, што гэта такое і для чаго можа спатрэбіцца. Настаўнік дастае з торбы збан і называе, што гэта. Вучні самастойна чытаюць тэкст «Збан» і расказваюць, пра што яны даведаліся. Потым шукаюць адказ на пытанне, чаму людзі перасталі карыстацца збанамі. Пасля паўторнага чытання тэксту вучнямі ўголас яны выконваюць заданне па пошуку прымаўкі ў тэксце. Тлумачаць, што яна абазначанае. Запіс прыказкі праводзіцца з каменціраваннем. Вучні знаходзяць і падкрэсліваюць словы, у якіх усе гукі цвёрдыя. Ставяць у гэтых словах націск.

**5. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 105, практ. 152. Настаўнік нагадвае пра неабходнасць уважліва прачытаць і правільна выканаць заданне па падкрэсліванні літар.

**6. Этап падвядзення вынікаў урока.**

Настаўнік накіроўвае ўвагу вучняў на праблемнае пытанне, просіць адказаць на яго.

— Ці дасягнулі мы той мэты, якую ставілі ў пачатку ўрока?

## Урок 32. Цвёрдыя і мяккія зычныя гукі

***Мэта ўрока:*** фарміраваць уменне адрозніваць цвёрдыя і мяккія зычныя гукі ў слове і правільна перадаваць іх на пісьме; адпрацоўваць уменне вызначаць націск; развіваць фанематычны слых, вымаўленчыя навыкі; фарміраваць уменне вусна пераказваць, пісаць пад дыктоўку; развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць цікавасць да працы, жаданне дапамагаць дарослым.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

***Практыкаванне 152.***

Пасля чытання прыказак вучні тлумачаць, як разумеюць іх значэнне. Асноўная ўвага пры праверцы дамашняга задання надаецца характарыстыцы падкрэсленых вучнямі літар мяккіх і цвёрдых зычных, літар галосных гукаў, якія абазначаюць цвёрдасць і мяккасць зычных на пісьме.

**3. Этап замацавання вывучанага.**

***Практыкаванне 153.***

Праца над практыкаваннем арганізуецца па пытаннях падручніка ў зададзенай паслядоўнасці. Калі вучні не змогуць адказаць на пытанні, то настаўнік просіць іх знайсці пару складоў, у якой няма пытальніка. *(Ма-мі.)* Вучні вызначаюць агульны прынцып падбору складоў. Трэба адзначыць, што ў кожным выпадку могуць быць падабраныя некалькі складоў. Гэта ўхваляецца, але для запісу трэба ўзяць толькі адзін склад. У запісаных складах падкрэсліваюцца і агучваюцца літары, якія абазначаюць мяккасць зычных гукаў, прыводзяцца прыклады слоў з гэтымі складамі.

***Практыкаванне 154.***

Перш, чым прыступіць да выканання заданняў практыкавання, трэба дапамагчы вучням зразумець тэкст скорагаворкі. Для гэтага настаўнік пасля чытання скорагаворкі запытваецца: «Як звалі хлопчыка? Што ён маляваў? Чым ён маляваў?» Потым скорагаворка чытаецца рознымі спосабамі: па радках, гучна, ціха, па адным слове. Вучні знаходзяць словы, якія адрозніваюцца адным гукам (*лоўка — Лёўка*), даюць характарыстыку гукаў, якімі яны адрозніваюцца. Пасля запісу гэтых слоў вызначаюць, якімі літарамі абазначана мяккасць і цвёрдасць зычных гукаў.

***Практыкаванне 155.***

Работу ў групах «пілотаў» і «касманаўтаў» трэба пачаць з тлумачэння задання для кожнай групы. Пасля вуснай працы па дапаўненні слоў, якая арганізуецца па запыце вучняў, выконваецца пісьмовае заданне з падкрэсліваннем літар.

***Практыкаванне 156.***

Настаўнік прапануе прачытаць словы, запісаныя на дошцы: *дапамога, ур..джай, вёска, бульба, мяхі, склеп.*

— Якія з гэтых слоў вам не зразумелыя? Здагадайцеся па гэтых словах, пра якую важную працу будзе гаварыцца ў тэксце, які зараз прачытаем.

Вучні выказваюць свае меркаванні. Настаўнік прапануе прачытаць тэкст і вызначыць, ці спраўдзіліся здагадкі. Пасля абмеркавання зместу тэксту арганізуецца праца па пераказе тэксту. Перад запісам часткі тэксту пад дыктоўку вучні тлумачаць літары, якія трэба ўставіць у словы. Запіс пад дыктоўку арганізуецца паводле алгарытму на форзацы 2. Пасля запісу вучні робяць самаправерку па падручніку.

**4. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 108,練 практ. 157. Настаўнік папярэджвае, што пры спісванні трэба захаваць форму верша.

**5. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Якім чынам літары паказваюць цвёрдасць і мяккасць зычных? Якія гэта літары?

## Урок 33. Мяккі знак — паказчык мяккасці зычнага гука

***Мэта ўрока:*** актуалізаваць веды пра ролю мяккага знака ў слове; фарміраваць уменне абазначаць мяккасць зычных гукаў на пісьме з дапамогай мяккага знака; адпрацоўваць уменне дзяліць для пераносу словы з ***ь***, суадносіць схему са словамі; развіваць фанематычны слых, вымаўленчыя навыкі; развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць пачуццё гумару.

***Абсталяванне:*** малюнкі, на якіх адлюстраваны вугал і вугаль; абручы з фішкамі сіняга і зялёнага колераў.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

***Практыкаванне 157.***

Вучні па запытанні настаўніка называюць свае любімыя стравы з бульбы. Расказваюць, як іх гатуюць. Пасля выразнага чытання верша з дамашняга практыкавання вучні называюць стравы, пра якія ў ім гаворыцца.

У гэты час чатыры вучні каля дошкі выпісваюць выдзеленыя словы з дамашняга практыкавання, падкрэсліваюць у іх літары, якія абазначаюць мяккія зычныя гукі. Ажыццяўляецца сумесная праверка выканання задання. Увага акцэнтуецца на спосабах абазначэння мяккасці зычных (літары ***ё, і, ь***).

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Абмеркаванне праблемнай сітуацыі.***

Настаўнік выразна чытае праблемную сітуацыю да слоў «...і рассмяялася». Запытваецца ў вучняў: «Як вы думаеце, чаму рассмяялася мама? Што хацеў напісаць Чамучык? Давайце паспрабуем напісаць гэта слова». Вучні пішуць на дошцы словы *вугал* і *вугаль*. Абмяркоўваюць, што на самой справе вымеў з печы Чамучык. Пажадана над словамі змясціць адпаведныя малюнкі.

— Чаму ў Чамучыка не атрымалася слова *вугаль*? Якая літара спатрэбілася, каб перадаць мяккасць гука [л']?

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Вучні чытаюць уголас праблемнае пытанне і спрабуюць адказаць на яго. Настаўнік абагульняе адказы і паведамляе тэму ўрока.

***Практыкаванне 158.***

Настаўнік прапануе вучням падрыхтавацца, каб прачытаць верш хорам. Адказвае на пытанні пра незразумелыя словы. Сам запытваецца, калі не запыталіся вучні, што значыць «дзінь» і «цінь». Вучні адказваюць, пра што гаворыцца ў вершы. Настаўнік арганізуе харавое рытмічнае чытанне верша (з пляскannem у далоні, прытупваннем, пастукваннем алоўкам і да таго падобнае на выбар настаўніка). Потым просіць загарнуць падручнік і прыгадаць словы, у якіх для абазначэння мяккасці зычных выкарыстаны мяккі знак. Вучні запісваюць гэтыя словы на дошцы і ў сшытках з каменціраваннем, падкрэсліваюць літару ***ь***, называюць колькасць гукаў і літар у кожным слове. Словы, якія падыходзяць да схемы з вучэбнага дапаможніка, адзначаюць любым спосабам.

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Настаўнік прапануе прачытаць інфармацыю рубрыкі «Ключ» і паспрабаваць адказаць на праблемнае пытанне.

**4. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 159.***

Практыкаванне можна выканаць, размеркаваўшы работу ў парах. Алгарытм работы вызначае настаўнік:

1. Размяркуйце ролі: хто будзе працаваць са словам з мяккім гукам, а хто з цвёрдым. (Вучні надзяваюць адпаведны абруч з фішкай сіняга ці зялёнага колеру.)

2. На першым малюнку пазнайце, што намалявана. Затым кожны вымаўляе абодва словы. Знайдзіце і паведаміце «сваё» слова.

3. Пракаменціруйце для суседа па парце і запішыце кожнае слова. Зрабіце ўзаемаправерку. Падкрэсліце літару, якая гука не абазначае. На што яна паказвае?

4. Знайдзіце другую пару малюнкаў. Памяняйцеся ролямі. (Работа адбываецца аналагічна.)

***Практыкаванне 160.***

Падрыхтоўка да чытання тэксту накіравана на дасягненне вучнямі яго разумення пасля першага прачытання. Мэтазгодна спачатку пазнаёміць дзяцей па малюнках на дошцы з дзейнымі асобамі: татам, хлопчыкам, які трымае булку ў руцэ, і пеўнем. Па малюнках вучні прагназуюць, што магло здарыцца.

Змест слоўнікавай работы складаюць словы *выхваляцца, уцякаць, вяртаўся, шпарка бегаць, чырванець.* Асобна трэба скіраваць увагу вучняў на разуменне выразу *гойсаеш навыперадкі.*

Пасля падрыхтоўкі настаўнік чытае тэкст уголас. Вучні слухаюць яго без апоры на тэкст (падручнікі загорнуты). Пасля слухання тэксту адказваюць на пытанні з практыкавання, змешчаныя перад тэкстам.

Пасля самастойнага чытання тэксту вучні знаходзяць у ім словы з літарай ***ь***. Падзяляюць іх для пераносу магчымымі спосабамі, запісваюць адным са спосабаў з каменціраваннем. Падкрэсліваюць літару ***ь***, даюць характарыстыку гука, мяккасць якога абазначана мяккім знакам.

***Практыкаванне 161.***

***Выкананне самастойнай работы.***

Спачатку заданне выконваецца вусна: вучні чытаюць сказы і называюць словы, якімі іх трэба дапоўніць; прыдумваюць працяг, што магло адбыцца далей.

Настаўнік падзяляе вучняў класа на тры варыянты і размяркоўвае паміж імі сказы. Вучні запісваюць па адным сказе, падкрэсліваюць у словах літары, якія абазначаюць мяккасць зычных.

**5. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 111,练практ. 162. Пасля прачытання скорагаворкі неабходна запытацца пра значэнне слова *апенькі*. Трэба звярнуць увагу на характарыстыку гука [й']: ён з'яўляецца мяккім гукам.

Вучням задаецца таксама паўтарыць слоўнікавыя словы.

**6. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— З дапамогай якіх літар можна абазначыць мяккасць зычных гукаў на пісьме? Якая з іх гука не абазначае?

**Урок 34. Гук [дз']. Яго абазначэнне на пісьме. Кантрольны слоўнікавы дыктант**

***Мэта ўрока:*** актуалізаваць веды пра гук [дз'], фарміраваць уменне правільна абазначаць яго літарамі ***дз*** на пісьме; адпрацоўваць уменне правільна вымаўляць гук [дз'] у словах; праверыць сфарміраванасць навыку правапісу вывучаных слоўнікавых слоў; развіваць фанематычны слых, вымаўленчыя навыкі; развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць ветлівыя адносіны адзін да аднаго.

***Абсталяванне:*** карткі са слоўнікавымі словамі.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап правядзення кантрольнага слоўнікавага дыктанта*.**

Кантрольны слоўнікавы дыктант выконваецца ў сшытках для кантрольных работ. Вучнямі пазначаецца дата выканання работы, напрыклад 25 лістапада. Від работы не ўказваецца.

Перад пачаткам дыктанта настаўнік прапануе адгарнуць старонку 140 вучэбнага дапаможніка і паўтарыць пройдзеныя слоўнікавыя словы: прачытаць іх уважліва з бязгучнай артыкуляцыяй.

Потым настаўнік дыктуе абраныя словы, вучні запісваюць іх. Словы запісваюцца з чырвонага радка ў радок праз коску. Пасля запісу ўсіх слоў вучням даецца час на самаправерку.

Для таго каб зняць псіхалагічнае напружанне, можна прымяніць займальныя прыёмы. Напрыклад, спачатку з размешчаных адваротным бокам картак з пройдзенымі слоўнікавымі словамі выцягнуць шэсць, якія і будуць прадыктаваны. Або дыктаваць словы, карткі з якімі выцягваюць са скрыні выкліканыя вучні.

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Абмеркаванне праблемнай сітуацыі.***

Для найбольш яскравага ўвядзення праблемнай сітуацыі пажадана даць вучням паслухаць урывак песні на беларускай мове, дзе ёсць гук [дз']. Пасля гэтага настаўнік чытае тэкст праблемнай сітуацыі і выслухоўвае здагадкі вучняў. Якую адметнасць мае гук беларускай мовы [дз']?

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Вучні вызначаюць тэму ўрока, а настаўнік фармулюе яго мэту: даць характарыстыку гука [дз'], вучыцца перадаваць яго на пісьме дзвюма літарамі ***д*** і ***з***.

***Практыкаванне 163.***

Арганізуецца гутарка па кожным малюнку, у выніку якой вызначаюцца сказаныя словы ветлівасці.

Малюнак 1. Дзе сустрэліся хлопчыкі? Як вы здагадаліся? Што яны робяць? Якія словы гавораць адзін аднаму? У якіх словах ёсць гук [дз']? *(Добры дзень.)*

Малюнак 2. Што будзе рабіць бабуля? Пра што яна папрасіла хлопчыка? Што скажа ёй хлопчык? Што адкажа яму бабуля? *(Вялікі дзякуй.)*

Вучні запісваюць вызначаныя словы ветлівасці і падкрэсліваюць у іх літары, якімі перадаецца гук [дз'], а таксама літару галоснага гука пасля яго.

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Вучні самастойна знаёмяцца з правілам.

— Пра якія характарыстыкі гука [дз'] вы даведаліся з правіла?

**4. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 164.***

Задача практыкавання заключаецца ва ўзнаўленні навыку суцэльнага чытання гука [дз']. Таму павінны выкарыстоўвацца разнастайныя прыёмы чытання слоў, запісаных у слупках. Напрыклад, у прамым і адваротным парадку, праз слова, уроскід за ўказкай, першыя, другія і г. д. словы кожнага слупка. Кожны раз ставіцца і кантралюецца задача злітнага вымаўлення гука [дз']. Для гэтага выкарыстоўваецца ўзаемаправерка вучнямі вымаўлення гукаў у словах.

Потым выконваецца пісьмовае заданне. Вучні чытаюць, якія словы трэба выпісаць, знаходзяць гэтыя словы ў слупках у адпаведнасці са значэннем і запісваюць іх з каменціраваннем.

***Практыкаванне 165.***

Пры выкананні практыкавання трэба звярнуць увагу вучняў, што гук [дз'] выразна вымаўляецца ў словах. Для гэтага настаўнік выразна чытае скорагаворку і просіць вучняў паназіраць, які гук яны чуюць на месцы пропускаў. Вучні чытаюць скорагаворку самастойна франтальна напаўголаса і індывідуальна ўголас. Настаўнік і вучні сочаць за правільнасцю вымаўлення гука [дз']. Перад самастойным запісам скорагаворкі на дошцы запісваюцца словы, у якіх былі прапушчаны літры. Вучні падкрэсліваюць літары, якімі перадаецца гук [дз'] на пісьме, і наступную літару. Потым вучні самастойна паводле алгарытму на форзацы спісваюць скорагаворку і робяць узаемаправерку.

**5. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 114, практ. 166. Настаўнік выразна чытае верш. Запытваецца пра тое, які гук чуецца на месцы пропускаў, якімі літарамі ён абазначаецца на пісьме.

**6. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Які гук даследавалі на ўроку? Што важнае пра яго даведаліся?

*Працяг будзе.*

* Згодна з Дадаткам 3 да «Метадычных рэкамендацый па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі», кантрольны слоўнікавы дыктант павінен складацца з 6 слоў.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Вольскі, В. Ф.* Месяц за месяцам: Каляндар беларускай прыроды : для малодш. шк. узросту / В. Ф. Вольскі. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1975. — 95 с.
2. Дзіцячы атлас Беларусі / тэкст, уклад. П. Грынчанкі. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2017. — 39 с.

**Крыніцы ілюстрацый:**
https://avatars.mds.yandex.net/i?id=0bc34459bf723e2906f6d6b89091d277-5869402-images-thumbs&n=13&exp=1;
https://media.healthday.com/Images/icimages/OS18048.jpg;
http://zabavniks.com/wp-content/uploads/18-408.jpg;
https://i.pinimg.com/736x/2e/81/cc/2e81cc0538d1e1ffe7f7340fe5c133e9--watercolors.jpg;
https://papik.pro/uploads/posts/2021-11/thumbs/1636029683_37-papik-pro-p-lastochka-vektornii-risunok-39.png;
https://printonic.ru/uploads/images/2016/03/14/img_56e65a58ab4d8.jpg;
http://zabavniks.com/wp-content/uploads/zhuravl_4_07085424-834x1024.jpg;
https://i.pinimg.com/736x/51/40/3e/51403ee73c251bab444905091c6e65d2--album.jpg;
https://cdn.pixabay.com/photo/2014/04/03/00/33/fish-308654_1280.png.

***Муравьёва Г. Л.**, кандидат педагогических наук, доцент, заведующий кафедрой естественно-научных дисциплин Белорусского государственного педагогического университета имени Максима Танка;*
***Урбан М. А.**, доктор педагогических наук, доцент кафедры естественно-научных дисциплин Белорусского государственного педагогического университета имени Максима Танка;*
***Гадзаова С. В.**, старший преподаватель кафедры естественно-научных и лингвистических дисциплин и методик их преподавания Гродненского государственного университета имени Янки Купалы*

# Математика. IV класс

## Методические рекомендации

*Продолжение. Начало см. № 7–9 за 2022 г.*

*Форма выполнения каждого задания обозначена с помощью букв: **Д** — задание представлено на доске и выполняется фронтально; **П** — выполняется индивидуально учащимися на партах; **ДП** — выполняется на доске и на партах.*

### Урок 34. Единица площади — квадратный дециметр

***Цель:***

- познакомить с единицей площади — квадратным дециметром.

**Устные и практические упражнения.**

**Д 1.** Проводится фронтальный опрос:

— Назовите пять чисел, следующих за числом 299 998.

— Во сколько раз увеличится число 567, если справа к нему приписать один нуль? два нуля?

— Какое число предшествует числу 5 000?

— Какое число следует за числом 48 099?

— Назовите наибольшее пятизначное число.

— Назовите наименьшее шестизначное число.

— Назовите единицы первого (второго) класса числа 250 108.

— Представьте число 250 108 в виде суммы разрядных слагаемых.

— Сколько всего десятков в числе 250 108?

**Д 2.** Предлагается выбрать фигуру с наибольшей площадью (рис. 1).



*Рисунок 1*

**Д 3.** Требуется определить лишнее значение величины в каждом ряду:

27 кг, 3 000 г, 270 км, 35 кг, 30 г;

4 200 см, 28 000 м, 1 000 км, 100 см$^2$, 36 000 мм.

**Работа с учебным пособием.**

*Объяснение нового материала.* Учащиеся знакомятся с новой единицей площади — квадратным дециметром. Можно предложить проблемную ситуацию: например, попросить измерить площадь школьной парты (или доски) в квадратных